інфармацыі. Па яго словах, мэта такіх дзеянняў — падрыў аўтарытэту нашых дзяржаў на міжнароднай арэне.

«Пад фэйкі часам падводзяцца і небяспечныя, агрэсіўныя дзеянні. Вазьміце атакі дронаў на Расійскую Федэрацыю. Што, гэта ў ваенных адносінах нешта значыць? Практычна нічога. А вось пад фэйкі гэта падставіць — быццам і праходзіць. І ў Расіі, і ў нас, яшчэ дзесьці пачынаюць абмяркоўваць: «ах-ах-ах». Таму інфармацыйна-псіхалагічная вайна — гэта аснова, а пад яе падводзяць усё: і эканоміку, і навукова-тэхнічнае супрацоўніцтва, і інтэрнэт, і нават узброеныя правакацыі», — адзначыў Прэзідэнт. Па яго словах, фактычная інфармацыйная манаполія Захаду, а менавіта кантроль над інтэрнэтам, асноўнымі сацыяльнымі сеткамі і міжнароднымі СМІ гэтаму толькі спрые.

«Адметна, што гэту манаполію, а таксама сваё маніякальнае імкненне не дапусціць стварэння шматпалярнага свету яны прыкрываюць лозунгам барацьбы за дэмакратыю. Нічога за гэтай дэмакратыяй не стаіць. Ніякай там дэмакратыі няма. Дзякуй богу, мы ўжо ў гэтым пераканаліся. Мы бачылі, як дзейнічаюць у Амерыцы і што яны спрабуюць нам падсунуць. Пад гэтым лозунгам заходнія эліты зробяць усё, каб сарваць любыя інтэграцыйныя працэсы, прымусіць нашыя дзяржавы да адмовы ад партнёрскіх стасункаў, штучна стварыць пункты напружання на прасторы СНД і вакол яе. Самы красамоўны прыклад — цяперашняе становішча Украіны, якую ў геапалітычных гульнях выкарыстоўваюць для размену», — растлумачыў кіраўнік дзяржавы. Па яго словах, разведінфармацыя, якая паступае ў тым ліку па каналах партнёрскіх сувязяў — спецслужбаў, сведчыць, што пералічаныя пагрозы ў агляднай перспектыве будуць толькі нарастаць.

> **Адзіная, напэўна, наша памылка, што мы не вырашылі гэта пытанне ў 2014—2015 гадах, калі не было ні арміі ва Украіны, ні гатоўнасці... Усе хацелі мірна неяк урэгуляваць. А яны за гэты час стваралі баяздольныя ўзброеныя сілы.**

## У СПАКОІ НАС НЕ ПАКІНУЦЬ

«Калі хтосьці з нас думае, што атрымаецца адсядзецца, — дарма. Красамоўны таму прыклад — нядаўнія падзеі ў Казахстане. Там і ўнутраны элемент, як заўсёды. Проста ж на голым месцы не бывае. Заўсёды маецца нейкі ўнутраны элемент. Ёсць сілы, зацікаўленыя ў дэстабілізацыі, вяртанні да ўлады, яшчэ нечага. Але потым вакол гэтага ўнутранага элемента хутка замежныя спецслужбы ствараюць цэлую кучу гэтых элементаў, якія садзейнічаюць дэстабілізацыі абстаноўкі ў нашых рэспубліках. Але прыклад Казахстана і ў тым, што мы тады ўсе аб'ядналіся. І, здаецца, нічога не зрабілі, але толькі ўбачылі нашу рашучасць — адступілі. Таму нам трэба быць адзін да аднаго бліжэй», — упэўнены Аляксандр Лукашэнка.

У дачыненні да Беларусі, як адзначыў кіраўнік дзяржавы, у Польшчы, Літве і Украіне вядзецца навучанне членаў незаконных узброеных фарміраванняў, робяцца спробы стварэння спячых экстрэмісцкіх ячэек непасрэдна ў краіне. Пра гэта сведчаць факты. Ён нагадаў пра нядаўнія сумесныя аперацыі з Расіяй, у выніку якіх былі прадухілены тэракты ў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што гэта сведчыць аб тым, што ў спакоі нас не пакінуць.

«Баевікі рыхтуюцца ва Украіне, яны абкатваюцца на фронце. Некаторыя гінуць там з ліку збеглых беларусаў. Рыхтуюцца атрады ў Польшчы, Літве, Чэхіі для таго, каб у патрэбны момант перакінуць у Беларусь. І гэта ўжо не 2020 год, калі дзяўчынкі хадзілі ў белых кароткіх спадніцах з кветачкамі на дэманстрацыі. Людзі ўжо гатовыя прыйсці сюды са зброяй у руках. Таму нам даводзіцца шмат увагі ўдзяляць абароне нашых рубяжоў», — адзначыў ён.

Як заўважыў Прэзідэнт, раней заходнія куратары фінансавалі збеглую апазіцыю за заявы ў СМІ, а цяпер патрабуюць актыўных і рашучых дзеянняў. Гэта значыць, грошы ў абмен на тэракты, толькі пад узброеную барацьбу. Аляксандр Лукашэнка параіў усім дзяржавам звярнуць на гэта ўвагу, паколькі датычыцца ўсіх.

«Гэта значыць, у нас рыхтуюць сілавы сцэнарый змены ўлады. Мы гэта бачым. І мы гэтага не дапусцім. Вам добра вядома, у той ці іншай ступені пагрозы датычацца ў тым ліку і вас. Падстаў для правакацый і нацыску не дапускайце. Любыя дзеянні і рашэнні дзяржаў Садружнасці, якія не адпавядаюць чаканням Захаду, могуць стаць падставай для абвінавачванняў і санкцый. Ваша роля ў гэтай сітуацыі шматразова ўзрастае», — сказаў беларускі лідар.

Адной з пляцовак для выпрацоўкі мер рэагавання на такую палітыку злоснікаў з'яўляецца Савет кіраўнікоў органаў бяспекі і спецслужбаў краін СНД. «Я абсалютна ўпэўнены, што толькі сумеснымі намаганнямі мы зможам супрацьстаяць гэтай агрэсіўнай атацы і справіцца з любымі пагрозамі. Мы сёння ў стане гэта зрабіць, і на такім узроўні нам трэба трымацца», — падкрэсліў Прэзідэнт.

## КАЛЕКТЫЎНЫ ЗАХАД УЗЯЎ КУРС НА ДЭСТАБІЛІЗАЦЫЮ КРАІН САДРУЖНАСЦІ

Дырэктар ФСБ Расіі Аляксандр Бортнікаў расказаў, што на папярэднім пасяджэнні савета ў мінулым годзе быў зроблены прагноз, як зменіцца аператыўная абстаноўка. Па яго словах, тыя ацэнкі пацвердзілі падзеі гэтага года. «Калектыўны Захад узяў курс на дэстабілізацыю краін Садружнасці


Фота БелТА.

і Саюзнай дзяржавы шляхам рэзкага павышэння канфліктнага патэнцыялу на ўсёй прасторы СНД і каля яе межаў», — расказаў ён. На заходнім напрамку паскоранымі тэмпамі нарошчваецца ваенная прысутнасць НАТА. У Польшчу, прыбалтыйскія краіны і Румынію перакідваюцца буйныя воінскія кантынгенты, цяжкая тэхніка і баявая авіяцыя. «Украіна стала плацдармам для вайны супраць Расіі і вядзення падрыўной дзейнасці супраць Беларусі. Да ўдзелу ва ўкраінскім канфлікце заходнікі актыўна падцягваюць Малдову, падбухторваюць яе да сілавой зачысткі Прыднястроўя і Гагаузіі. Паблізу граніцы Саюзнай дзяржавы рэгулярна праводзяцца вучэнні і баявое зладжванне сіл НАТА, а таксама ўкраінскіх і малдаўскіх спецслужбаў», — адзначыў Аляксандр Бортнікаў. Па яго словах, Альянс каардынуе дыверсійна-тэрарыстычную дзейнасць узброеных фарміраванняў і спецслужбаў кіеўскага рэжыму, папаўняе шэрагі УСУ замежнымі наёмнікамі і баевікамі міжнародных тэрарыстычных арганізацый, ажыццяўляе разведвальнае і тэхнічнае забеспячэнне баявых вылазак украінскіх дыверсантаў і агентуры ў адносінах да ваенных і грамадзянскіх аб'ектаў. Аляксандр Бортнікаў таксама звярнуў увагу на спробы атакаваць аб'екты ядзернай энергетыкі і паліўна-энергетычнага комплексу.

«Разам з гэтым Злучаныя Штаты Амерыкі і Вялікабрытанія актыўна працуюць на раз'яднанне краін Садружнасці. Сіламі разведсупольнасці і дыппрадстаўніцтваў вядуць работу з палітычнымі і эканамічнымі элітамі дзяржаў СНД. Гэта сённяшняя сітуацыя, яна рэальна складваецца. Мы гэта ўсё бачым. Пад пагрозай другасных санкцый або абяцаннем прэферэнцый імкнуцца ўбіць клін паміж нашымі краінамі, навязваюць пазарэгіянальным гульцам выгадныя фарматы супрацоўніцтва ў сферы абароны і бяспекі», — расказаў Аляксандр Бортнікаў. Па яго словах, пацвярджэнне таму — частыя візіты кіраўніцтва сілавых ведамстваў блока НАТА ў краіны СНД. Паводле яго слоў, амерыканская і брытанская разведкі пры падтрымцы масмедыя і падкантрольных некамерцыйных арганізацый разгарнулі маштабную дзейнасць па падрыхтоўцы ўмоў гвалтоўнай змены ўлады ў краінах СНД. «Мы гэта бачым і прымаем меры, каб нейтралізаваць гэтыя пагрозы», — заявіў дырэктар ФСБ.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «Мы пачалі збіраць плады лёсавызначальных рашэнняў у рамках Саюза Беларусі і Расіі»

**Адзін з фактараў гарантавання бяспекі — устойлівае эканамічнае супрацоўніцтва. Менавіта яму была прысвечана сустрэча Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам Ліпецкай вобласці Ігарам Артамонавым. Гэтымі днямі дэлегацыя рэгіёна з рабочым візітам наведвае Беларусь.**

Вітаючы гасцей, кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ў Беларусі і Ліпецкай вобласці ўжо створаны задзел для далейшага пашырэння супрацоўніцтва. Гэта, паводле слоў Прэзідэнта, пацвярджаюць актыўныя кантакты з Ліпецкай вобласцю за апошнія два гады і даныя эканамічнай статыстыкі. Двухбаковы тавараабарот за мінулы год склаўся ў памеры 330 мільёнаў долараў. «Лічба нядрэнная, але, як мы гаворым, паўмільярда лепш. Таму мэта — імкнуцца дасягнуць тавараабароту аб'ёмам 500 мільёнаў. Я думаю, гэту планку мы дасягнём на працягу найбліжэйшага часу. Рэзерваў дастаткова. Тым больш мы ўжо пачынаем, калі можна так сказаць, збіраць плады, не пабаюся такога слова, лёсавызначальных рашэнняў у рамках нашага саюза Беларусі і Расіі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка, падкрэсліўшы, што ў гэтай сферы было прынята шмат рашэнняў на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. «Прымаючы лёсавызначальныя рашэнні, мы аказвалі падтрымку нашым урадам і міністрам у развіцці кааперацыі, перш за ўсё прамысловай кааперацыі», — сказаў беларускі лідар.

Прэзідэнт звярнуў увагу, што Расія сур'ёзна рушыла наперад у развіцці сельскай гаспадаркі. Прычым гэта адбылося не без удзелу Беларусі. А цяпер на парадку дня ўзаемнага супрацоўніцтва — высокатэхналагічныя галіны, перш за ўсё мікраэлектроніка.

«Заходнікі сышлі, і дзякуй богу, што сышлі. Мы будзем развіваць сваё. Вы ведаеце, што наша былая краіна, у якой мы ўсе жылі — Савецкі Саюз, — у прынцыпе абыходзілася незалежна ад Захаду. Проста розуму не хапіла захаваць краіну. Але мы маглі тады, зможам і цяпер», — перакананы Аляксандр Лукашэнка. Ён падкрэсліў, што ключавымі напрамкамі эканомікі з'яўляюцца тэхналагічны суверэнітэт і вытворчая кааперацыя. Цяпер да кааперацыі пачынаюць падцягвацца і іншыя краіны, якія былі раней у Савецкім Саюзе. «Мы выпрацоўваем і знаходзім кірункі супрацоўніцтва. І не толькі распрацоўваем канкрэтныя праграмы, але рэалізоўваем канкрэтныя кантракты па стварэнні тых або іншых вытворчасцяў. Гэта значыць, кааперацыя развіваецца, пазітыўны вопыт у нас вялікі. У нас добры базіс для далейшага эканамічнага развіцця», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, маюцца сур'ёзныя напрацоўкі для развіцця кааперацыі з Ліпецкай вобласцю.

«Перакананы, магутным зыходным пунктам можа стаць наша прысутнасць на Ліпецкім трактарным заводзе, дзе мы хочам стварыць сумесную вытворчасць тэхнікі «Амкадор». Гэты брэнд вядомы ў Расіі, вельмі запатрабаваны. Сыход заходніх кампаній вызваляе нам з вамі месца для пашырэння супрацоўніцтва і нашай сумеснай работы», — заўважыў Прэзідэнт.

У Ліпецкай вобласці некалькі гадоў таму пачалі праграму развіцця гарадскога электратранспарту. Па словах Аляксандра Лукашэнкі, гэта праблема рана ці позна паўстане перад любым горадам Беларусі, Расіі. Гарады становяцца насычанымі, населенымі, таму экалагічна чыстая тэхніка патрэбна будзе ў вялікіх аб'ёмах. «Мы гатовы пастаўляць вам поўную лінейку пасажырскай і сельскагаспадарчай тэхнікі, прычапнога і навяснога абсталявання. Гэта адносіцца і да дарожнай тэхнікі», — запэўніў ён.

Прэзідэнт прапанаваў развіваць супрацоўніцтва ў перапрацоўцы прадукцыі АПК. Перспектыўным ён таксама лічыць супрацоўніцтва ў мадэрнізацыі зернесушыльнай гаспадаркі, у сферы будаўніцтва. «Мы працуем на расійскім будаўнічым рынку. Гатовы любы аб'ект, калі трэба, вам пабудаваць, у чым вы можаце пераканацца асабіста, наведаўшы «Мінск-Арэну», — сказаў ён.

Размова ішла таксама аб падрыхтоўцы да правядзення Дзён Рэспублікі Беларусь у Ліпецку, якія намечаны на восень гэтага года. «Прадставім усё самае найлепшае, каб нашы браты бачылі, як развіваецца Беларусь, і бачылі вынікі нашай сумеснай работы», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт запэўніў, што ўсе дамоўленасці, дасягнутыя падчас візіту дэлегацыі Ліпецкай вобласці ў Беларусь, будуць абавязкова выкананы. «Можаце быць на 100 працэнтаў упэўнены, што мы гэта выканаем, рэалізуем. Мы людзі абавязковыя, тым больш гэта ж не дабрачыннасць. Гэта наша жыццё, наша эканоміка. Калі яна працуе, значыць, і краіна будзе развівацца».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

## У нас будзе дынаміка


Фота БелТА.

У размове з журналістамі Ігар Артамонаў падкрэсліў, што супрацоўніцтва паміж Ліпецкай вобласцю і Беларуссю развіваецца па розных кірунках. Напрыклад, кожны другі трактар, які закупляе рэгіён, — беларускай вытворчасці. У рэгіёне любяць беларускія прадукты і бытавую тэхніку.

«Мы абмяркоўвалі магчымасці для беларускіх праекціроўшчыкаў прыйсці на ліпецкі рынак. У Беларусі ёсць сур'ёзныя кампетэнцыі ў выглядзе дзяржаўных праектных інстытутаў, якія сёння востра неабходныя ў Расіі. Шмат мы размаўлялі і аб магчымасцях для беларускіх будаўнікоў прыйсці на нашы сацыяльныя аб'екты», — расказаў губернатар.

Ліпецкай вобласці цікавыя беларускія беспілотнікі, яны актыўна выкарыстоўваюцца ў сельскай гаспадарцы. Бакі абмяркоўваюць і стварэнне сумеснай зборачнай вытворчасці тэхнікі «АМКАДОР» на базе Ліпецкага трактарнага завода.

«Гэта значыць, мы шмат знайшлі пунктаў для судакранання. І, я спадзяюся, у нас будзе новая дынаміка», — адзначыў Ігар Артамонаў. Тавараабарот Беларусі з Ліпецкай вобласцю Расіі стабільна нарастае з 2020 года. У 2021-м ён склаў $315 млн, у 2022-м дасягнуў амаль $334 млн. Пры гэтым беларускі экспарт вырас з $70 млн у 2021-м да больш як $91 млн у мінулым годзе, або на 31 працэнт.